УДК 808.26-07

Р.В.Міксюк, старшы выкладчык
кафедры беларускай мовы

# ЛІНГВАКРАІНАЗНАЎСТВА ЯК АСПЕКТ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА ЗАНЯТКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

The article gives some recommendations in methodics and ways of cognitive activity stimulation at the Belorussian language classes, it gives some special attention to a lingua-regional geography aspect.

Прафесійнае станаўленне спецыялістаў непасрэдна звязана з гуманітарызацыяй адукацыі, што прадвызначае поўнае развіццё чалавечай асобы ў кантэксце грамадства. З улікам удасканалення навейшых тэхналогій выкладання прадметаў гуманітарнага цыкла, трэба імкнуцца так арганізаваць навучальны працэс, каб забяспечыць умовы не толькі поўнага і ўсебаковага авалодання беларускай мовай, але захавання і памнажэння ў працэсе навучання інтэлектуальнай спадчыны і культурна-гістарычных каштоўнасцей беларускага народа, выхавання самасвядомасці, паважлівых адносін да нацыянальнай мовы, народных традыцый, а таксама садзейнічання развіццю творчых здольнасцей студэнтаў.

На працягу дзесяцігоддзяў змест адукацыі ў беларускамоўных школах быў вырваны з этнакультурнага кантэксту і насіў "мутантны характар", не меў арыентацыі на каштоўнасці нацыянальнай культуры.

Адной з галоўных задач, якія ставяцца сёння перад сістэмай адукацыі ў Беларусі, з'яўляецца неабходнасць нацыянальна-культурнага адраджэння, вяртання да нацыянальнай спадчыны і яе засваення праз сродкі адукацыі на ўсіх ступенях.

Апошнім часам спрабавалі паскорыць "адраджэнне", аднак сілавымі метадамі нацыянальную свядомасць аднавіць нельга. Падмурак будучыні, заснаваны на духоўнай спадчыне народа, трэба будаваць разумна, выкарыстоўваючы найбольш прымальныя формы і метады арганізацыі пры навучанні і выхаванні.

Для ажыццяўлення пастаўленых задач трэба пашырыць на занятках беларускай мовы разгляд лінгвакраіназнаўчых тэм, такіх, як, напрыклад, "Беларускае кнігадрукаванне", "Мастацтва Беларусі ў русле сусвету", "Славутыя землякі", "Экалагічныя праблемы і шляхі іх вырашэння", "Этнаграфія Беларусі", "Анамастыка і мой край" і падобныя.

Тэксты могуць быць падабраны з мастацкай літаратуры, з энцыклапедычных даведнікаў, гістарычных матэрыялаў. Літаратурныя творы адлюстроўваюць пэўныя моманты гістарычнага развіцця нацыі, нясуць інфармацыю аб сацыяльным, палітычным, эканамічным, культурным, этнаграфічным характары краіны. Літаратура дае каштоўны матэрыял для

сацыялагічных абагульненняў, дыскусій. І ёй ва усім багацці і разнастайнасці найбольш поўна падаецца нацыянальная мова.

На занятках важна не толькі даць . веды па граматыцы і краіназнаўству, але і абудзіць узнаўляльную і творчую пазнавальную дзейнасць, выклікаць унутраную актыўнасць для творчага пошуку, жаданне даведацца новае пра сваю краіну. Ажыццяўленню гэтай мэты будзе спрыяць выкарыстанне інтэрактыўных метадаў навучання, важнейшай умовай якіх з'яўляецца свабода асобы. Другая ўмова — нестандартнасць правядзення заняткаў. Напрыклад, група дзеліцца на мікрагрупы (па 5-6 чалавек), улічваючы іх уласны выбар. Далейшыя заданні выконваюцца калектыўна ў сваіх мікрагрупах. Трэцяя умова — стварэнне праблемнай сітуацыі. Праблемныя пытанні або заданні павінны быць такімі, каб студэнты добра адчулі магчымасць іх вырашэння і у той жа час выяўлялі недастатковасць наяўных ведаў, што і выкліча ў іх жаданне пошуку.

Актывізаваць працэс пазнавальнай дзейнасці дапамогуць такія віды работ, як запаўненне тэкстаў-партрэтаў, тэкстаў закрытага тыпу з шэрагам адказаў, адзін з якіх з'яўляецца правільным, тэкстаў закрытага тыпу з некалькімі правільнымі адказамі, тэкстаў адкрытага тыпу, у якіх патрабуецца дапоўніць пералічаныя характарыстыкі.

Найбольш эфектыўнымі для развіцця пазнавальнай дзейнасці студэнтаў прапаноўваюцца наступныя творчыя работы з улікам інтэрактыўных метадаў навучання.

Інтэлектуальны бой. (Краіназнаўчая тэма аб'яўляецца папярэдне. Студэнты самастойна падбіраюць матэрыял па тэме, рыхтуюць пытанні, якія будуць задаваць свайму праціўніку на наступных занятках. Інтэлектуальны бой можна праводзіць па мінігрупах, радах, паміж асобамі. Пытанні да інтэлектуальнага бою можа падрыхтаваць і выкладчык).

Дыскусія. (Прапанаваная тэма "Народная адукацыя ў Беларусі" ахоплівае два віды пазнавальнай дзейнасці: узнаўляльную, калі студэнты робяць паведамленні аб гісторыі адукацыі у Беларусі, і творчую, калі студэнты самі складаюць праект-рэкамендацыю "ВНУ у будучым". Лепш праводзіць такі від работы па мікрагрупах. Кожная пяцёрка будзе мець свой праект і прэзентаваць яго на аўдыторыю. У выніку дыскусіі прапануецца адзін асноўны праект).

Спаборніцтва. (Задача заключаецца не толькі ў колькасным напісанні аб'ектаў, але і ў лінгвальна правільным іх афармленні. Напрыклад, тэма "Пазнай свой край" патрабуе ведаў аб культурных каштоўнасцях краіны, яе гарадах, эканоміцы, ведаў аб жыцці і творчасці славутых землякоў і падобнае; тэма "Беларускі фальклор" — ведання прыказак, прымавак, фразеалагізмаў; тэма "Народныя стравы" — адпаведна назваў страў і прэзентацыі рэцэптаў.

Спаборніцтва лепш праводзіць паміж мікрагрупамі, бо такая праца мае і вялікі выхаваўчы змест.Кожны студэнт, нават той, хто менш ведае, адчувае сябе пераможцам, адзінкай калектыву.

Прэзентацыя рэфератаў па краіназнаўчых тэмах з творчым заданнем.(Студэнт рыхтуе рэферат па пэўнай тэме, складае да яго тэматычны слоўнічак, картачкі з граматычнымі заданнямі, пытанні па тэме і, выкарыстоўваючы падрыхтаваны матэрыял, самастойна праводзіць урок, правярае заданні і ацэньвае іх).

Выкарыстанне шматлікіх форм і метадаў актывізацыі пазнавальнай дзейнасці ў галіне лінгвакраіназнаўства будзе спрыяць развіццю маўленчых здольнасцей студэнтаў, творчых здольнасцей, дапаможа адраджэнню нацыянальнай культуры і годнасці будучым пакаленням беларусаў.

УДК 808.2(07)

Т.А.Козлякова, преподаватель
кафедры белорусского языка

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ТСО В ПРЕПОДАВАНИИ РУССКОГО ЯЗЫКА КАК ИНОСТРАННОГО

The problems connected with the use of technical means at the elementary level of education of foreign students are examined in the articte. Models of laboratory tests are given.

Современная методика обучения иностранным языкам рассматривает ТСО как обязательный компонент учебного процесса.

Опыт занятий по русскому языку как иностранному свидетельствует о том, что наиболее благоприятные условия для работы с аудитивными средствами обучения создаются во время занятий в лингафонных кабинетах.

Эти кабинеты оборудуются по следующим системам обучения: аудиопассивной, аудиоактивной и аудиокомпаративной.

1. Аудиопассивная система обеспечивает возможность прослушивать фонограммы с магнитофона преподавателя (она предназначена для упражнения в аудировании).

2. Аудиоактивная система позволяет слушать фонограмму и практиковаться в говорении всем студентам одновременно.

3. Аудиокомпаративная система дает возможность студенту записать свой голос на индивидуальный магнитофон, а затем прослушать запись и сравнить с образцовой. Эта система обеспечивает тренировку в аудировании и говорении, а также проведении самостоятельной аналитической работы.

Использование звукозаписи позволяет: